# Беларускі фальклор



Легенды і паданні
Казкі
Прыказкі і прымаўкі

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2026

УДК 398(161.3)
ББК 82.3(4Беи)
Б43

Серыя заснавана ў 2023 г.

Для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту

Спасылкі на аўдыязапісы ў выглядзе QR-кодаў прыведзены па выданнях:

Зборнік беларускага фальклору : з гук. электрон. дадаткам / тэксты чытае Н.А. Кухарава. — Мінск : Вышэйшая школа, 2010. — (Школьная бібліятэка).

Зборнік беларускага фальклору. Легенды і паданні. Казкі : аўдыякніга / тэксты чытае Н.А. Кухарава. — Мінск : Вышэйшая школа, 2013. — (Бібліятэка школьніка).

**Беларускі** фальклор : легенды і паданні, казкі, прыказкі і прымаўкі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2026. — 271 с. – (Чытай і слухай).
Б43
ISBN 978-985-34-0555-2.

Выданне ўключае творы вуснай народнай творчасці і змяшчае спасылкі ў выглядзе QR-кодаў на аўдыязапісы лепшых фальклорных матэрыялаў. Легенды, паданні, казкі, прыказкі і іншыя матэрыялы запісаны на тэрыторыі Беларусі ў XIX–XX стст. вядомымі вучонымі-фалькларыстамі, этнографамі, мовазнаўцамі і літаратарамі (А.К. Сержпутоўскім, П.В. Шэйнам, Е.Р. Раманавым, К. Каганцом і інш.). Вусная народная творчасць дае яскравае ўяўленне пра светапогляд беларусаў, іх інтарэсы і звычаі. Гэта бяздонны скарб і неацэнная ўласнасць, якую народ павінен шанаваць і перадаваць з пакалення ў пакаленне.

Адрасавана школьнікам, а таксама будзе цікава ўсім, хто захапляецца беларускай вуснай народнай творчасцю, духоўным набыткам нацыі.

**УДК 398(161.3)**
**ББК 82.3(4Беи)**

*Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва.*

**ISBN 978-985-34-0555-2**

© Афармленне. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2026

# Легенды і паданні



*Справай вялікага значэння з’яўляецца ці то збіранне легенд, якія засталіся з часоў дахрысціянскай славяншчыны, у мэтах чыста гістарычных, ці то мастацкае адкрыццё цераз іх мінулага, што мроіцца за імглой вякоў, мінулага, частку вестак пра якое данеслі летапісы, частку дакапваемся мы з курганоў. Здаецца, гэта няшмат, але і з такой крыхі геніяльны паэт можа стварыць рэчы гамераўскай магутнасці, бо шмат таго, што нам недараcказала кніжка або старая магіла, знайсці можна пад саламянаю страхою народа, які ў паданнях, казках, прыказках, прымхах і мове захаваў яшчэ мноства дахрысціянскага элементу. Вышэй жа за ўсё – умець падслухаць біццё сэрца гэтага народа, умець адкрыць іерогліфы легенд ключом уласнай шчаслівай інтуіцыі, умець узнавіць вобразы мінулага ў барвах і контурах, якія на працягу стагоддзяў асталіся, – вось задача паэта, вось яго наглядная ніва.*

*Уладзіслаў Сыракомля*



## Прамова

Гэй, хлопцы, брацця мае, сыны Зямлі Беларускай, каторая раскінулася ад Гродны да места Смаленска і ад Прыпяці аж на другі бок ракі Дзвіны перакінулася. Кіньце ўвакол вокам, сабярыце харашэнька думкі і скажэце, ці павінна так быць, як цяпер ёсць? Ці справядліва гэта – усяго, што сваё, чурацца: і мовы сваёй, і звычаю свайго, і апраткі сваёй? А ведаеце тое, што мова наша калісь слаўнай была і быў час, калі наша мова працвітала пры дварэ каралёў польскіх. Ведайце, што спамеж вас больш, як спамеж другіх народаў славянскіх, слаўных людзей выходзіла даўней і цяпер выходзіць і розумам і ваеннымі заслугамі.

Колькі-то вучоных людзей, колькі-то слаўных казакоў, ваявод і гетманаў наша зямліца выгадавала?

Адно нядобра, што кожны славу прыносіць не сваёй староннцы, а ўсё чужым. Прымерам кажучы, як той Галубок, просты селянін зямлі Наваградскай, што са сваёю сотняю казакоў – ці мала славы прыдбаў паляком так, што і песні аб ім складалі. А ў нас? Ці ведае хто яго?

І бяру я гэта ўсё на розум, і здаецца мне, што хутка саўсім загіне наш народ, бо яшчэ за гадоў трыста таму, як паны, так і халопы свае мовы не саромеліся: і гаварылі, і пісалі ўсё па-свойму. Потым мала-памалу паны сталі сваіх звычаяў чурацца, сталі свае парадкі і мову сваю пакідаці ды польскую пераймаці і так, што далей – болей, аж саўсім палякамі сталі. На паноў гледзячы, пачалі і сяляне апратку сваю мяняць на нямецкую і мову калечыць. Нават сваіх спяванак пачынаюць саромецца, мужыцкімі называюць.

Але не! Наш народ не загіне, а прыйдзе такая часіна, што прачнецца наш народ і скажа суседзям так: «Служылі мы вам – заплаціце вы нам! Нам грошай не трэба, бо свайго хопіць хлеба. А скажэце нам толькі: “Беларусы вы!” Вось толькі!»

Дый красна ж бо наша зямліца, усе выгады мае: і скіба ўрадлівая, і лесу багата, і сена аж надта. І рэчак сплаўных многа, а па краёх, як бы ад ворага абгароджаная пяском, балотамі ды цёмнымі лясамі. Вось выйдзі толькі дзе-небудзь на гару, пад гай зялёны, ды азірніся на свет божы! Так душа твая і зарадуецца.

Бач! Уніз ад рэчкі гара зараснікам пакрытая, уся арэшнікам, чаромхай, каліннікам ды маліннікам зарасла. А чаромха-то цвіце — няйначай хто пухам лябяжым укрыў, і пах за вёрсты ветрам нясе. А рэчка сама — моў стужка блакітная, між верб ды альшын ветрам раскінутая. А за рэчкай лука аж зіхаціць кветкамі. А далей за лукай поле зелянее. А ўвакол усяго цёмны лес сінее. Глянь улева — панскі двор бялее і таполі тырчаць, моў на старожы стаяць; а ўправа сяло ціха лягло, паўз раку на беразе. У сады прыбрана яно, а ў сяле хлопцы, як дубкі, а дзяўчаты, як ягадкі. Пазіраеш на ўсё гэта, і штось за сэрца шчэміць і грудзі шырака раздымае, і ляцеў бы, здаецца, над палямі, над лугамі, па-над лесам сінім...

І на гэтай нашай зямлі спрадвеку нашы дзяды-прадзеды жылі, каторыя не раз грэкамі, немцамі і рымлянамі траслі...

## Вялікі грэшнік

Даўно гэта дзеялася... Чула я ад старых людзей — а яны лгаць не будуць — значыць, праўда была. Жыў на свеце дужа вялікі грэшнік. Такі грэшнік, што не было таго граха, каб ён не саграшыў. Такі быў злодзей, якога і свет не бачыў: ён і краў, і чыніў разбоі, губіў людзей без пакаяння... Нават чорту душу запрадаў; чараваў, калі краў, абарачваўся ваўкалакам, пушчаў моравае паветрые — і не было ліку яго грахам.

Прыйшлося яму паміраць. Тут такі страх яго агарнуў, што не магла яго душа пакінуць цела. Няма яму смерці, ды й годзе. Тут успомніў ён на Бога. Захацеў паспаведацца, душу ачысціць. Сколькі не прыводзілі к яму папоў, ксяндзоў, — як раскажа ім свае грахі, — не даюць адпушчэння. Такі ён быў грэшнік. А смерць не прыходзіць, а душа яго мучыцца, з целам не можа разлучыцца.

Раздаў ён сваё багацце ўбогім і пайшоў па свету шукаць таго ўгодніка, каб замаліў яго грахі, разлучыў душу з целам. Ідзе, распытвае...

Параілі яму людзі даведацца к аднаму пустэльніку, што цэлае жыццё жыў у пушчы, еў толькі хлеб з вадой, маліўся, душу спасаў і ўгодны быў Богу. І пайшоў ён к яму. Прыходзіць — так і так, — кажа, — я дужа вялікі грэшнік, ратуй мяне, — выспаведуй. Ты ўгодны Богу, — можа адпусціць мае грахі. Стаў спаведацца. Выслухаў яго той пустэльнік, кажа:

— Ты такі грэшнік, што цябе смерць не возьме, зямля не прыме, пакуль ты свае грахі на гэтым свеце не адпакутуеш, пакуль ты не зробіш столькі дабра, каб яно тваё грахі пераважыла. А датуль ты будзеш мучыцца.

І пайшоў той грэшнік заслужваць спасення. Хадзіў ён на афяры, і хадзіў на каленях, марыў голадам сваё цела, нанімаўся к сярдзітым гаспадарам на работу, каб яго білі, лажыўся за другіх пад розгі, служыў хворым і ўбогім — смерць не прыходзіць. Хацеў на сябе рукі налажыць: тапіўся, вешаўся і рэзаўся — усё няма смерці, толькі мукі прымаў надарэмна.

І так прайшло многа год. Раз ідзе ён полем. Ідзе і праклінае сваю долю. Узяла яго злосць, што няма яму смерці. «Дакуль я буду мучыцца?» — думае ён сабе. А быў першы дзень Вялікадня. Ідзе ён і бачыць многа-многа народу на полі — пашуць, барануюць. «Што ж бы гэта значыла? — думае ён, — першы дзень Вялікадня такое свята, што і птушкі святкуюць — гнёзды не ўюць, а тут народ марудзіцца». Падыходзіць бліжэй, бачыць — войт пахаджвае паміж работнікамі і бізуном іх падганяе. Тыя плачуць, жалюцца:

— Што гэта, — кажуць, — ты насміхаешся над намі? Хіба няма ў цябе Бога ў сэрцы? Б'еш нас, катуеш у будні, у свята не даеш адпачынку... І нават сягоння, на Вялікдзень, выгнаў на прыгон!

А войт раве, як апантаны, бізуном лупіць. Глядзеў, глядзеў той грэшнік. «Во, — думае, акаянны, ні папушчы мяне! Падумаць гэта, як народ мардуе!» Падышоў ён к войту і кажа:

— Што ты робіш? За што ты людзей мучыш?

А войт, ні слова не кажучы, як нахлысне бізуном цераз лоб, — аж іскры з воч пасыпаліся. Азвярэў наш грэшнік, схваціў камень, як пусціць ім у войта... І разбіў яму чэрап. Войт не айкнуў — сасвяжыўся. А грэшнік і скончыў сваю пакуту.

## Як чалавек зрабіў агонь

Першы агонь к нам прыляцеў з Перуном, да як загарэўся адзін хварастовы курэнь, дак людзі збегліся адусюль хапаць галавешкі, да па сваіх курэнях і зямлянках у попелі пераховываць. Аднача гэты агонь не шанцаваў нікому, аж пакуль аднаму старому калёсніку, каторы акрамя калодак тачыў і верацёна, не паслаў шчаслівае думкі, штоб ён папрабаваў кружкі на верацёнах вышпульваць ясянёвым клінком да не нажом вырэзваць як досі.

– Чаму не, – кажа калёснік сам сабе, – ясень цвярдзей, дак павінен узяць мякчэйшую бярозу, і давай ось папробуем.

Застругаўшы ясянёвы клінок, прыставіў яго к верацяну, моцна прыжымаючы, і зачаў смычком шморгаць то сюды, то туды, што раз скарэй, аж палянь – пашоў дым з верацяна, да так пахне, бы з вогнішча. Ён гэта далей шморгаць да яшчэ скарэй да хутчэй, аж покуль лоб стаў мокры да з верацяна іскры пасыпаліся. Дак вось як чалавек знайшоў справядлівы агонь, тагда людзі ўсюды патушылі перуновае цяпло да завялі свойскі агонь і з тых пор сталі лучшэй жыць.

## Асілкі

Даўно, даўно, калі яшчэ людзі жывалі па лясах драмучых, прыйшлі ў цяперашнюю Утужыцкую абшчыну асілкі і занялі яны два места, адно на рэчцы Вараухе, у Забарышчах, а другое – на Іваніхе пры той жа рэчцы. У тых мясцінах у тое ўрэмя ніякага народу не было, мяста былі вольныя па ўсёй Жанвіль-Утужыцкай старане. У лясах той стараны жылі звяры ўсякія: мядзведзі, воўкі, ласі, кабаны, лісіцы, рысі, а па рэках і азярах жылі выдры: рыбы ў вадах было такое мноства, хоць палоўнікам чэрпай.

Асілкі тыя былі людзі здаровыя, росту ў касую сажань, у плячах аршына з два, голас мелі, як звон немалы, бывала калі крыкнець ва ўвесь голас, ды свіснець, дык якое б дзе дзерава не было бальшое, а заваліцца. Вот якія былі яны людзі тыя асілкі.

Хазяйства яны ніякага не трымалі, не было ў іх ні якой худобы, ні скацінкі дамашняй, ні прыпасу, ні запасу. Ні хлеба, ні лёну не сеялі. Кармілісь яны тым, што лавілі па лясах звярэй ды па вадах рыбу. Адзежу сабе яны строілі з звярыных шкур. Вот так і жылі. Мусіць пра Бога яны зусім не зналі, бо ніхто не чуў ад старыкоў, штоб яны мелі дзе-небудзь царкву алі папа. Асілкі, пажыўшы на рацэ Вараухе, спадабалі Жанвіль-Утужыцкую старонку, бо тут ім усяго досыць было. Звяр'я па лясах было відзьма-нявідзьма і рыбы ў водах тожа, а ім больш нічога і не трэбавалась. Вот і задумалі яны абсяліцца і пачалі сразу строіць два гарадзішча – Заборкі і Іваніху. Народу тут было многа, шутка сказаць, кажынны год бабы прывадзілі па два ды па тры рабёнкі.

Струменту ў іх амаль ніякага не было. Кажуць, што ў іх быў на ўсіх адзін тапор, ды і той не жалезны, а якісь медзяны, а можа і жалезны, пра гэта дзяды не сказывалі, мусіць, не запомнілі. Адно

звесна, што асілкі не мелі струменту, а гарадзішчы строілі. Гарадзішчы гэтыя і цяпер ёсць на Вараусе, вот зараз ідзі і паглядзі. Не меўшы досыць струменту, асілкі перабрасывалі тапор з гарадзішча і на гарадзішча, бо не хацелі траціць часу на хаджэнне. Зыкнець, бывала, асілак з аднаго гарадзішча ў другое, тапор давай, той возьмець тапор ды й кінець яму. Такая была ў іх сіла, за то і празываліcь асілкамі. Гэта яшчэ нешто тапор перакінуць, вярсты за тры, а то, бывала, нада на пастройку дзерава, пойдзець у лес, вырвець дзерава з карнём ды так і прэць на гарадзішча, а то камень прыдзецца прыставіць, дык ён возьмець яго ды й кінець за вярсту і больш прама на гарадзішча. Другія кідалі такія бальшушчыя камні, што будзець у полсажня велічынёю, алі такія камні не ўсягды дакідывалі да гарадзішча. А то ёсць такія мясціны, што саўсім закіданы камнямі. Дзяды казалі, што на гэтых самых мясцінах асілкі друг супроць дружкі ваявалі, кідаясь камнямі. Яны і звярэй убівалі камнямі, адтаго камні і ляжаць аж сягодня па лясу. А далі сказывалі старыкі, што асілкі ўшлі адсюль, як толькі пераваліся ў лясах звяры і пазменшала рыбы ў вадзе, бо ім не з чаго стала жыць. З тых пор і гарадзішчы іхныя запусцелі, бо пасля іх не скора прышлі сюды нашы дзяды, каторыя абабралі сабе другія мясціны, каторыя больш спасобны для хлебапашаства і для разводу скацінкі.

## Адкуль сяляне і паны

Бог першага чалавека вылепіў з гліны, да, паставіўшы пад плотам, штоб сох, сам кудысь пайшоў; тагды прыбег чорт, да з тае гліны, што асталася, вылепіў такога самюсенькага другога чалавека, да й кажа сам да сябе:

— Як жа я пазнаю, калі Бог ажывіць абодвух, каторы яго, а каторы мой? Трэба неяк свайго назначыць.

Зірнуў ён кругом, ці няма якое ламакі, ды не знайшоў нічога, а тут чуе, што Бог падыходзіць, дык барджэй плюнуў сваёй леплёнцы ў лоб ды й пабег. Бог прыйшоў ажыўляць ды бачыць, што стаяць дзве леплёнкі, як адна, начэ дзве краплі вады.

— Хіба ж, — кажа, — я дзве вылепіў? Здаецца адну... а мо і дзве? Не прыпомню.

Узяў да й ажывіў абедзве, а як яны заварушыліся, то з божае выйшаў хадзяін-пахар, а з чортавае — нейкае благароддзе ў казённай шапцы, з кругленькаю бляшкаю, акурат на тым месцы, дзе чорт плюнуў. Тагды хазяіну Бог сказаў:

— Ідзі да гасподы!

А благароддзю, узяўшы за шыварат, даў каленам... Начэ выгнаў, не даўшы ніякага спосабу.

## Колькі жыць чалавеку

Калісьці ў далёкім мінулым кожны чалавек знаў, колькі яму гадоў жыць на свеце. Але адзін раз адбылося такое.

Ішоў Бог па зямлі. Зайшоў у адну дзярэўню і відзіць, што адзін чалавек робіць плот з саломы. Бог паглядзеў на яго і пытаецца:

— Ты чаго, чалавеча, плот не з дрэва гародзіш, а з саломы?

— Дык мне ж ужо мала гадоў жыць на свеце асталося. На мой век хваціць.

Тады Бог рашыў зрабіць так, каб людзі не зналі, каму калі паміраць. Так і цяпер.

## Чаму не аднолькава работы ва ўсіх?

Было яшчэ так. Хадзілі па зямлі Пётра з Богам і не ведалі, каму што прыдзяліць. Ну, ідуць яны. Сонца нізка. Падыходзяць да жанчыны, якая жала, пытаюцца, як прайсці ім туды ды туды, просяць, каб паказала ім дарогу. А яна кажа:

— Сонца нізка, мне жаць трэба. Не буду паказваць, ідзіце, куды хочаце.

Ну, раз такое дзела, пайшлі яны далей. Косіць мужык. Падышлі яны да мужыка і кажуць:

— Ці не паказаў бы ты нам дарогу, як туды ды туды прайсці?

Мужык кажа:

— Чаму ж не, пакажу.

Закурыў і павёў іх да дарогі, паказаў, куды трэба ісці. Далей ідуць, ідуць, ходзіць конь. Пытаецца Бог у каня:

— Як бы ты нам дарогу паказаў?

А конь глянуў:

— Сонца нізка, я не пад’ем. Не павяду вам паказваць дарогі.

— Ну, ладна, не павядзеш, дык хадзі, грызі.

Пайшлі далей. Ходзіць карова. Просіць Бог у каровы, каб паказала ім дарогу.

— Чаму ж не, — кажа карова, — пакажу.

Павяла іх і на дарогу вывела. Ну, вот і кажа Бог на Пётру:

— Слухай, што гэта будзя: вот гэта жанчына будзе век рабіць, і ёй век будзе работы па горла — ніколі не паробіць. А мужык паробіць і ўсягды яму будзе вольны час. А конь таксама — будзе грызці, грызці, і ніколі яму не дадуць пад'есці, а карова паходзіць — ужо і жвакуе, ужо і пад'ела.

## Чаму варагуюць сабака, кот і мышы

Перш і сабака меў шляхэтскія паперы. Ну вядомо: дзе яму з імі насіцца. Аддаў ён кату і просе:

— Схавай, братко (перш сабака, кот і мышы былі з сабой у дружбе), пад страху дзе высока, там цалей будзіць.

Кот узяў ды аддаў мышам схаваць пад падлогу, бо баяўся, што пад страхой найдзе хто. Адылі*, бача сабака, што яго ніхто не шануе, — акрыўдзіўся, мысля: «Я ж ім пакажу, хто я такі!» Пашоў к кату, просі дастаць паперы. Той палез к мышам, — аж яны даўно іх з'елі. Ну з тых пор у іх і пашлі гэта нінавісць адзін к аднаму: сабака на ката, а кот на мыш.

## Пра скарб

Там, дзе ад шляху пашла паваратка на Зялёную Параслю, у правую руку, як ісці ад Рэчыцы к Хвайнікам, у калодзезі е вялікі браварны казан, поўны грошай, накрыты млінавым каменем. Сколькі раз людзі хацелі выкапаць тыя грошы, да як толькі дакапаюцца да таго каменя, каторым пакрыты кацёл, так зараз з Рэчыцы і ляцяць казакі з голымі шаблямі. Людзі паўцякаюць, то і казакі шчэзнуць, а далей і места зараўняецца, як бы нічога ніколі.

## Як п'яніца ў рай папаў

Прыходзіць п'яніца к царству нябеснаму і ў дзверы стукае:

— Адчыніце!

У апостала Пятра ключы ад царства нябеснага; дык ён чуе стук, падыходзіць к дзвярам:

— Хто тут?

* *Адылі* — тут у значэнні *але*.

– Ды я.
– Хто ж ты?
– Ды п'яніца. Пусці мяне ў царства нябеснае!
– Ну, тут п'яніц няма – нельга!
– А ты хто, што мяне не пускаеш?
– Я апостал Пётр!
– Я знаю цябе: гэта той, што ад Хрыста адракаўся, не паспеў пятух тры разы прапець, а цяпер ты ў міласці ў Бога! А я, хоць і п'яніца, а Хрыста не забываю: калі пападзецца чарка гарэлкі, то гавару: «Госпадзі, благаславі!» А ад Хрыста я ні разу не адракаўся, як ты. Я ўсё, брат, знаю.
Няма чаго гаварыць Пятру супроць гэтага, назад вярнуўся, падышоў к Паўлу:
– Ідзі, Павел, пагавары ты з ім!
Падыходзіць Павел к дзвярам.
– Хто тут?
– Я, п'яніца; пусці мяне ў царства нябеснае!
– Тут п'яніц не прымаюць.
– А ты хто, што мяне не хочаш пусціць?
– Я апостал Павел.
– А, Павел! Знаю: гэта той самы, што гнаў Хрыста ад Ерусаліма да Дамаска; а цяпер ты ў яго ў міласці! А я ж ніколі Хрыста не гнаў, а калі прыдзецца чарачка гарэлкі, то зараз жа: «Госпадзі, благаславі!» І не гнаў Хрыста па-твойму.
Нечага адказваць Паўлу супроць гэтага: вярнуўся назад і расказаў Пятру пра ўсё. Гаворыць Пётр:
– Ну, пашлём евангеліста Івана: ён ад Хрыста ні разу не адракаўся – няхай-ка з ім пагаворыць.
Падыходзіць к дзвярам Іван:
– Хто тут?
– Я, п'яніца; пусціце мяне ў царства нябеснае!
– А, ты п'яніца і просішся! Такіх сюда не прымаюць.
– А ты хто такі, што не хочаш мяне ўпусціць?
– Я евангеліст Іван!
– А, ты евангеліст! Навошта ж вы абманваеце людзей! Вы напісалі ў евангеллі: стучыце – і адчыняць вам; прасіце – і атрымаеце! Хіба гэта не абман! Я гадзіны дзве стаю і стукаю, а мне не адчыняюць. Калі ты мяне не ўпусціш у царства нябеснае зараз жа, то я вярнуся на белы свет і раскажу людзям, што вы напісалі ў евангеллі няпраўду.
Спужаўся Іван сораму і ўпусціў п'яніцу ў царства нябеснае.

## Пра вайну са шведамі

У 1709 годзе, калі Пётр Вялікі атрымаў вядомую перамогу пад Палтаваю над шведскім каралём Карлам XII, шведы па дарозе назад пераходзілі праз Валожын, абрабавалі і разарылі тутэйшых жыхароў. Яны ўварваліся таксама ў царкву.., забралі там усё... і паставілі ў ёй коней. Некаторыя з шведскіх салдат пачалі былі страляць у абраз святой Параскевы... і за тое... аслеплі.

Услед за шведамі прыйшоў атрад рускіх войск, а з ім і сам рускі цар, Пётр Вялікі. Ён асабіста аглядаў аграбленую непрыяцелямі царкву.

## Бітва пад Лясной

Швед, разбіты пад Лясной, трапіў у балота Чыстая Лужа. Там патанулі ў дрыгве яго гарматы, коні, людзі, а галоўны начальнік іх – Левенгаупт – кінуўся цераз Брадзілаў мост на Прапойск. Прапойскія перавознікі на вачах у шведаў хутка знішчылі паромы на Сожы. У той жа час на левым баку Сожа, у Старынцы і Краснаполлі, з'явіліся казакі. Яны не дапусцілі шведаў да пераправы і пагналі іх далей, на Рудню... Тут шведы пакідалі сваё ваеннае снаражэнне ў балота і разбегліся па лясах, ратуючыся ад пагоні рускіх... Начальнікі шведскія кінуліся да Сожа, закапалі там пад сасновым крыжам купу золата і срэбра... І давай уцякаць па слядах свайго караля.

## Вайна шведска

Як то было кедысь цяжка на свеце, неспакой, от шведска вайна была, мноства рознага войска цягалася па свеце. От тады ішлі якіясьці Сасы, Тарантасы, не зналі нашай мовы, а мы іх. Бог іх ведае, як яны гаварылі, толькі ўвойдзе да хаты і крычыць: «Пекі курка!», то ледзьве дамысліліся, што ён кажа – палі печ. Забіралі людзям хлеб, авёс, на хвурманкі гналі, а некаторыя як паехалі, то і прапалі з імі зусім. От, кажуць, з Дрыгі неякі Баран Мацей і Балдыка стары прапалі. А возьмуць дзяцей, пазасаджаюць шыямі за лаву, прыціснуць лаваю і падушаць. А старшыя паўцякалі да лесу, дзеўкі ўсе ў лесе сядзелі, бо не можна было быць дома.

# ЗМЕСТ

**ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ** . . . 3
Прамова . . . 5
Вялікі грэшнік . . . 6
Як чалавек зрабіў агонь . . . 7
Асілкі . . . 8
Адкуль сяляне і паны . . . 9
Колькі жыць чалавеку . . . 10
Чаму не аднолькава работы ва ўсіх? . . . 10
Чаму варагуюць сабака, кот і мышы . . . 11
Пра скарб . . . 11
Як п’яніца ў рай папаў . . . 11
Пра вайну са шведамі . . . 13
Бітва пад Лясной . . . 13
Вайна шведска . . . 13
Платон-казак . . . 14
Дзяды расказвалі . . . 15
Векавечная мяжа . . . 16
Чортаў мост . . . 17
Пра татарскія курганы . . . 22
Вітаўка . . . 22
Пявун-звон . . . 23
Казацкі гаёк . . . 24
Пакаранне . . . 24
Месяц . . . 26
Вось як даўней старых бацькоў кідалі . . . 27
Пра пане Каханку . . . 28
Пра Чорную Даму . . . 29
Трохгранны дуб . . . 31
Дуб і сасна . . . 31
Легенда кахання . . . 31
Помнік вернаму каханню . . . 32
Марысін парк . . . 32
Пра бярозу Міцкевіча . . . 33
Пра князя слуцкага і яго замак на Князь-возеры . . . 33
Пра пана Карпінскага і чортава вакно . . . 34
Прылукі . . . 35
Адкуль зязюля ўзялася . . . 37
Пра зязюлю . . . 38
Як мы вучыліся . . . 38
Здарэнне з прыставам . . . 39
Дзядзіна . . . 40
Як Мікола і Пётр коней ва Украіне куплялі . . . 41
Ілья і Пятро . . . 42
Правільны суддзя . . . 45
Бутрымава прыгода . . . 45

Чорт дурыць падарожных . . . 46
Нечысць заманьвае ў балота . . . 47
Чорт у віхры . . . 48
Чорт у постаці цяляці . . . 49
Чорт скінуўся бараном . . . 50
Дамавік ездзіць на конях . . . 52
Хут . . . 53
Як чорта выганялі . . . 53
Скрыпач і ваўкі . . . 54
Нядзеля . . . 56
Серада і пятніца . . . 57
Паморак . . . 58
Трасца . . . 60
Напасць . . . 61
Халера . . . 62
Халера 40-га року . . . 63
Чаму воўк з сабакам ды з кошкай і мышкай варагуюць . . . 64
Чаму заяц, ліса ды воўк разам не сыходзяцца . . . 65
Чым болей хто мае, тым болей жадае, або адкуль мядзведзі на свет узяліся . . . 66
Адкуль узяўся мядзведзь . . . 67
Адкуль мядзведзь . . . 68
Адкуль пайшлі буслы . . . 69
Чаму конь ніколі не пад'есць . . . 69
Чарадзейнік замовіў стрэльбу . . . 70
Моцны чарадзей . . . 70
Удзеяна . . . 72
Прыгожая Кінгі . . . 73
Аб Воўгі, Дняпры і Сажы, бацькі іх Нівісном . . . 74
Пра Нёман і Лашу . . . 75
Пра чайку і возера Нарач . . . 76
Ад чаго Нясвіж пашоў . . . 76
Машэка . . . 77
Нарач . . . 78
Пра возера Баторына . . . 80
Адкуль Рубеж . . . 81
Сож і Дняпро . . . 81
Паходжанне ракі Віліі . . . 82
Як нарадзіліся Нёман і Лоша . . . 84
Неман і Лоша . . . 85
Пра возера Свіцязь . . . 86
Чырвонае возера . . . 88
Сіняе возера . . . 91
Сіні калодзеж . . . 92
Паненчына бухта . . . 93
Жывая вада . . . 93
Паданне пра заснаванне Менска . . . 94
Паданне пра Магілёў . . . 95

Паданне пра заснаванне Бярэсця . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Адкуль Гомель . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Як паўстаў горад Браслаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Валожын . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Пра Давыд-Гарадок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Адкуль Івянец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Адкуль Капыль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Як узніклі Клімавічы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Лунінец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Стоўбцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Адкуль Узда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Налібакі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Пра вёску Падкамень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Перуноў мост . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Папова горка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Рымшава гара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Дзявочая гара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Мамчына горка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Пра Мір-гару . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Перунова гара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Багатыр-гара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Скарб у балоце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Як скарб з-пад печы выходзіў . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Заклятая магіла волата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Дзе цень сягае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Пра скарб, закапаны на Азярыйскім гарадзішчы . . . . 110
Заклятае багацце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Курган каля Заслаўя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Лоскія паданні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Змееў камень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Камень-кравец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Камень-шавец . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Цудадзейны камень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Літоўскі камень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
У ноч на Купалу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Ваўкалакі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Расамаха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121

**КАЗКІ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123

Каток, пеўнічак і лісічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Дзедава рукавічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Мужык, воўк і ліса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Ліса-каталічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Вайна ваўка з сабакам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Воўк, Змітрок, кабыла і баран . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Козы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Жораў і чапля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135

Курка-рабушка . . . . . . . . . . 136
Кот Максім — сват . . . . . . . . . . 138
Бабіна дачка і дзедава дачка . . . . . . . . . . 142
Аб рачку . . . . . . . . . . 145
Два ў кораб арэшкі . . . . . . . . . . 147
Іван Іванавіч-царэвіч . . . . . . . . . . 151
Залатое пяро . . . . . . . . . . 161
Рогі . . . . . . . . . . 170
Івашка-мядзведжае вушка . . . . . . . . . . 177
Пакацігарошак . . . . . . . . . . 187
Ілья . . . . . . . . . . 199
Курыла Кажамяка . . . . . . . . . . 203
Жораваў кашалёк . . . . . . . . . . 204
Дзіва . . . . . . . . . . 211
Асілак . . . . . . . . . . 213
Іванка-прастачок . . . . . . . . . . 216
Чорт-злодзей . . . . . . . . . . 218
Мужык, яго жонка і пан . . . . . . . . . . 221
Як лянівая дачка рабіць навучылася . . . . . . . . . . 223
Як мужык хітра гуся падзяліў . . . . . . . . . . 224
Кацярына . . . . . . . . . . 225
Пану навука . . . . . . . . . . 227
Мужык і пан . . . . . . . . . . 230
Асцярожны пасланец . . . . . . . . . . 233
Не люба — не слухай . . . . . . . . . . 237
Несцерка . . . . . . . . . . 238
Завідны поп . . . . . . . . . . 241
Шаптуха . . . . . . . . . . 242
Папоўская хцівасць . . . . . . . . . . 243
Мужык, пан і цар . . . . . . . . . . 247
Бацькавы наказы . . . . . . . . . . 248
Як я з дзедам пакутваў . . . . . . . . . . 249

**ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ . . . . . . . . . . 251**

Літаратурна-мастацкае выданне

Чытай і слухай

**БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР**

Легенды і паданні
Казкі
Прыказкі і прымаўкі

12+

Укладальнік і рэдактар *Ю.А. Місюль*
Мастацкі рэдактар *С.Д. Чыркоў*
Камп'ютарная вёрстка *Н.В. Шабуні*
Карэктар *А.І. Галдзянкова*

Падпісана да друку 11.03.2026. Фармат 60×90/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 17,0. Ул.-выд. арк. 15,0. Тыраж 800 экз. Заказ 95/26.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Капітал Прынт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/181 ад 04.11.2015.
Вул. Ф. Скарыны, 40-215, 220084, г. Мінск.